# ЗНАКАМІТЫЯ ЛЮДЗІ ПОЛАЦКАГА ПЕРЫЯДУ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ (960-1236)

## КНЯЗЬ РАГВАЛОД – ПЕРШЫ ПОЛАЦКІ КНЯЗЬ

Гады жыцця - 920-980

Гады княжання - 945-980



РАГВАЛОД. Малюнак Язэпа Драздовіча

У другой палове 10 ст. ў Полацку кіраваў незалежны ад Кіева і Ноўгарада князь Рагвалод.

У часы Рагвалода пачала існаванне першая беларуская дзяржава - Полацкае княства (з 960 г.)

У 980 г. Рагвалод і яго сям'я, за выключэннем дачкі Рагнеды, былі знішчаны кіеўскім князем Уладзімірам.

Княгіня Рагнеда насільна стала жонкай кіеўскага князя.

## КНЯГІНЯ РАГНЕДА



Рагнеда (960?-1000)

Дачка полацкага князя Рагвалода, жонка вялікага князя кіеўскага Ўладзіміра (Хрысціцеля).

Маці князёў:

Ізяслава Ўладзіміравіча (полацкі князь з 988 па 1001),

Яраслава Мудрага (Вялікі князь кіеўскі з 1019 па 1054, найбольш слаўны князь Кіеўскай Русі),

Усевалада (князь уладзіміра-валынскі),

Мсціслава (князь чарнігаўскі і цьмутараканскі),

а таксама князёвен - Прадславы (узяла шлюб з чэскім князям Баляславам)

і Праміславы (выйшла замуж за прынца вугорскага Ласла Сара Лысага).

## РАГНЕДА І ІЗЯСЛАЎ



У 986 г., пасля замаху Рагнеды на жыццё Уладзіміра, Ізяслаў, навучаны маці, сімвалічна з мечам у руках выступіў на яе абарону.



Ізяслаў Уладзіміравіч (979-1001), князь полацкі (986-1001), унук Рагвалода, сын Рагнеды Рагвалодаўны і Уладзіміра Святаславіча.

Ізяслаў абраны Полацкім князем у 986 г. Відавочна, што Рагнеда ў першыя гады апекавалася маладым князем.

У 1001 г., насуперак кіеўскай традыцыі пасля смерці Ізяслава стол у Полацку заняў не іншы Уладзіміраў сын, а сын Ізяслава - Усяслаў. У Полацку аднавілася самастойная княжацкая дынастыя, і Полацк выпаў з палітычнай сістэмы Кіеўскай дзяржавы.

Пачынаючы з Ізяслава, усе нашчадкі Рагвалода нязменна называлі сябе Рагвалодавічамі, а не Рурыкавічамі, як астатнія «рускія» князі.

## УСЯСЛАЎ ЧАРАДЗЕЙ



УСЯСЛАЎ ЧАРАДЗЕЙ
*Малюнак Я. Драздовіча*



Помнік У. ЧАРАДЗЕЮ ў Полацку.
*Скульптары Прохараў, Мінкевіч, Ігнацьеў, архітэктар Сакалоў*

Усяслаў Чарадзей (1018-1101), праўнук Рагвалода і ўнук Уладзіміра, Вялікага князя кіеўскага.

Вялікі князь кіеўскі (1067- 1068).

Пры яго княжанні (1044-1101) Полацкая дзяржава дасягнула найбольшага росквіту.

Усяслаў будаваў і ўмацоўваў ня толькі сваю сталіцу, але і іншыя гарады Полацкай зямлі: Браслаў, Друцк, Заслаўе, Лагойск, Копысь, Воршу, Менск.

# ЗНАКАМІТЫЯ ЛЮДЗІ ПОЛАЦКАГА ПЕРЫЯДУ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ (960-1236)

## УСЯСЛАЎ ЧАРАДЗЕЙ І САФІЙСКІ САБОР

**Князь Усяслаў пабудаваў Сафійскі сабор у Полацку (1044-1066), каб паказаць роўнасць Полацка з Кіевам і Ноўгарадам, дзе саборы ў гонар Сафіі былі пабудаваны раней. Будавалі мясцовыя і візантыйскія дойліды: Давыд, Мікула, Таўма, Капес, Пётр і Ворыш. У 1067 г. Ўсяслаў Чарадзей захапіў Ноўгарад і вывез звон і іншыя царкоўныя рэчы з Ноўгарадскага Сафійскага сабора ў Полацкі Сафійскі сабор. Сафійскі сабор шмат разоў перабудоўваўся паміж 11 і 17 ст.ст. На працягу 1596–1654 і 1668–1839 г.г. Сафійскі сабор быў кафедральным саборам грэка-каталіцкай (уніяцкай) царквы. У 1839 г. япіскап І. Сямашка зачыніў Беларускую грэка-каталіцкую царкву і далучыў яе да Рускай праваслаўнай царквы.**



Макет сабора 11 ст.



Сучасны выгляд

## ЕЎФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ



Помнік у Полацку (2000), скульптар – У. Голубеў

ЕЎФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ, Прадслава (1104-1173), дачка князя Святаслава, унучка славутага Усяслава Чарадзея.

Заснавала Спаскі і Багародзіцкі манастыры. Пры манастырах былі школы, дзе дзеці вучыліся чытанню, пісьму, "цыфры", царкоўным спевам і нотнай грамаце.



Першая жанчына ў усходніх славян, кананізаваная царквою ў святыя



Спаскі/Еўфрасіньеўскі манастыр

## ЕЎФРАСІНЬЕЎСКІ КРЫЖ



Аснова з кіпарыснага дрэва. Вышыня — 52 см, даўжыня верхняе папярэчкі — 14, ніжняе — 21, таўшчыня — 2,5 см. Зверху і знізу дрэва закрывала 21 залатая пласцінка з каштоўнымі камянямі, арнаментамі і 20 эмалевымі абразкамі.

Крыж, па заказу Еўфрасінні, зрабіў полацкі майстар-ювелір Лазар Богша ў 1161 годзе.

Надпіс на ім з´яўляецца каштоўным помнікам нашага пісьменства.

Там ёсць такія словы: «І хай не выносяць яго з манастыра ніколі, і не прадаюць, не аддаюць. Калі ж не паслухаецца хто і вынясе з манастыра, хай не дапаможа яму святы крыж ні ў жыцці гэтым, ні ў будучым, хай пракляты будзе ён святой жыватворнаю Троіцаю ды святымі айцамі... і хай напаткае яго доля Іўды, які прадаў Хрыста. Хто ж насмеліцца ўчыніць такое... валадар або князь або епіскап ці ігумення, або іншы які чалавек, хай будзе на ім гэты праклён. Еўфрасіння ж, раба Хрыстова, што справіла гэты крыж, здабудзе вечнае жыццё з усімі святымі...»

Крыж згублены падчас Другой сусветнай вайны. У 1997 годзе брэсцкі ювелір Кузьміч вырабіў копію крыжа.